# МЫ ПАЧЫНАЕМ СВОЙ ШЛЯХ...

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў да ўсяго падыходзяць творча, у тым ліку і да выпускных іспытаў. Ужо другі год запар студэнты кафедры мастацтва эстрады факультэта музычнага мастацтва выступаюць на гарадскім справаздачным канцэрце-экзамене «Мы пачынаем свой шлях».**

— Падобная форма дзяржаўнага іспыту практыкуецца штогод на кожнай кафедры нашага факультэта, — распавядае выконваючая абавязкі загадчыка кафедры мастацтва эстрады Таццяна Дробышава. — Але летась я прапанавала рэктару Юрыю Бондару прыцягнуць аркестр і выйсці на ўзровень горада, каб студэнты змаглі паўнавартасна пагрузіцца ў прафесійную атмасферу. Пляцоўкай стаў клуб імя Дзяржынскага, любы ахвотны можа прыйсці ў дні іспытаў: уваход вольны. Гэта спрыяе прыцягненню абітурыентаў, якія яшчэ не вызначыліся з прафесіяй.

У 2016 годзе такая форма здачы іспыту была апрабавана на вакалістах, а ў 2017 да іх далучыліся інструменталісты: цяпер у канцэрце аб'яднаны выпускнікі ўсяго факультэта. Акрамя таго, на бэк-вакале выступаюць навучэнцы малодшых курсаў, а танцавальны складнік нумароў сёлета забяспечылі студэнты кафедры харэаграфіі факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Пастаноўку нумароў робяць выкладчыкі.

Падчас іспыту кожны студэнт павінен выканаць 4 кампазіцыі: адну — беларускага кампазітара, другую — у канцэртна-тэатральным жанры (рок-опера, мюзікл і г.д.), трэцюю — на мове раманскай або германскай груп і чацвёртую — на славянскай мове. Такім чынам моладзь рыхтуюць да ўдзелу ў конкурсах на ўзроўні Еўропы (міжнародны конкурс эстраднай песні «Еўрабачанне») і Беларусі (міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»).

— У ліпені ў Віцебску, на конкурсе выканаўцаў эстраднай песні, Беларусь прадставіць наш трэцякурснік Ягор Шаранкоў, — адзначыла Таццяна Дробышава. — А наконт выпускнікоў хочацца дадаць: сёлета мы размеркавалі ўсіх, у тым ліку і тых, хто вучыўся платна і выказаў такое жаданне.

Акрамя справаздачнага канцэрта творчай рэалізацыі студэнтаў спрыяе праца ў буйных праектах універсітэта, у прыватнасці, мюзіклы «Дуброўскі» і «Казанова», пастаўленыя сумесна з расійскім кампазітарам і прадзюсарам Кімам Брэйтбургам. Таксама «Сем таямніц Беларусі» са снежня 2016-га ідуць штомесяц у Рэспубліканскім Палацы культуры прафсаюзаў пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Гэты праект дазваляе акунуцца ў гісторыю, культуру, традыцыі і побыт беларускага народа. Ва ўсіх пастаноўках студэнты могуць браць удзел і пасля выпуску.

**Шура ГРАМЫКА**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ